С.М.Якуба (Мінск)

# БЕЛАРУСКАЯ АНТРАПАНІМІКА І ТАПАНІМІКА: ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ

Дапрофільнае навучанне ў базавай школе накіравана на забеспячэнне індывідуалізацыі і развіцця асобы пры дапамозе змен у структуры, змесце і арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, што дазваляе найбольш поўна ўлічваць патрэбы вучняў у пашырэнні і паглыбленні ведаў па пэўных прадметах, рэалізаваць памкненні ў вырашэнні перспектыўных задач, прафесійнай накіраванасці навучання.

Курсы на выбар “Беларуская антрапаніміка” і “Беларуская тапаніміка” (на засваенне матэрыялу адводзіцца па 34 гадзіны) прапанаваны для вывучэння адпаведна ў IX і X класах базавай школы і адносяцца да так званых развіццёвых (агульнакультурных) курсаў, што закліканы “задаволіць пазнавальныя інтарэсы вучняў да той ці іншай галіны ведаў, якая … не пададзена ў інварыянтным кампаненце зместу адукацыі” [1, с.9]. Разам з тым яны накіраваны на фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі школьнікаў, паняцце якой ўключае ў сябе спасціжэнне нацыянальнай культуры, самабытнасці беларусаў праз асэнсаванне ролі роднай мовы ў жыцці народа і вывучэнне нацыянальна-маркіраваных моўных адзінак розных узроўняў. Прынцып вывучэння мовы і культуры (гл. працы Л. В. Юлдашавай) з’яўляецца адным са спосабаў матывацыі навучання беларускай мове, дае магчымасць сродкамі прадмета далучыць школьнікаў да духоўнай культуры народа. Як падкрэслівае В.У.Протчанка, роднае слова з’яўляецца “сродкам захавання этнічнай памяці і гуманных нацыянальных традыцый, пад уздзеяннем якіх вякамі фарміравалася і фарміруецца духоўнасць людзей” [ , с. ].

Беларуская антрапаніміка і тапаніміка адносяцца да лексічнага фонду беларускай мовы і, зразумела, як і лексіка, маюць свае этапы развіцця. Аднак варта адзначыць, што анамастычныя назвы – гэта энцыклапедыя мовы, своеасаблівая памяць народа, гістарычныя помнікі, у якіх адлюстравалася традыцыі, побыт беларусаў і іншых народаў, што пражывалі на нашай тэрыторыі і з якімі кантактавалі нашы продкі.

Для кожнага народа характэрна свая адметная антрапаніміка і тапаніміка. Нягледзячы на шматлікія страты, беларуская анамастыка таксама вызначаецца самабытнасцю і непаўторнасцю. Вывучэнне беларускіх геаграфічных назваў, імёнаў, прозвішчаў, мянушак дапаможа лепш пазнаць наша мінулае, даць уяўленне пра засяленне сучаснай тэрыторыі Беларусі са старажытнасці да нашых часоў, пра прыродна-геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця грамадства, пра кантакты беларусаў з суседнімі народамі.

З лінгвістычнага пункту гледжання актуальным будзе знаёмства з тапанімічнай і антрапанімічнай тэрміналогіяй, асноўнымі заканамернасцямі ўзнікнення, развіцця і трансфармацыі (фанетычнай,

марфалагічнай і інш.) беларускіх геаграфічных назваў, імёнаў і прозвішчаў тыпалогіяй анамастычнай лексікі, адметнасцю словаўтваральнай будовы і шляхамі фарміравання тапанімічных назваў.

Так, напрыклад, у вучняў будзе выклікаць цікавасць тлумачэнне значэнняў утваральных асноў для такіх прозвішчаў, як *Шавялёва (шавель -- авёс), Шапшалевіч (шэпшала -- стары чалавек), Гайдучонак (гайдук -- пешы, лёгка ўзброены салдат, слуга ў вяльмож для парадных выездаў), Шкрэдава (шкрэда -- “задзіра, упарты чалавек”, “малы, нізкарослы”);* этымалогія назваў населеных пунктаў *Ашмяны (ад літ. востры), Мазуршчына (мазур -- прадстаўнік этнічнай групы на тэрыторыі Польшчы), Рудзенск (руда – на тэрыторыі Беларусі здабывалі жалезную балотную руду), Блонь (блонь – заліўны луг), Лядзец (ляда – ачышчаны ад лесу надзел зямлі*) і інш.

Мэта курсаў на выбар -- пазнаёміць з багаццем і самабытнасцю беларускай анамастычнай лексікі, прынцыпамі і відамі яе класіфікацыі, адметнасцю ўтварэння беларускіх антрапанімічных і тапанімічных назваў, паказаць шляхі станаўлення, развіцця і захавання беларускіх імёнаў, прозвішчаў, тапонімаў і мікратапонімаў, садзейнічаць выхаванню паважлівага стаўлення да анамастычнай спадчыны як помніка нацыянальнай культуры і духоўнасці, усведамленню сябе і свайго народа часткай полікультурнага асяроддзя.

Курсы “Беларуская антрапаніміка”, “Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка” пабудаваны з арыентацыяй на такія прынцыпы, як

-- прынцып узаемазвязанага культурнага і лінгвістычнага развіцця асобы;

-- прынцып прыярытэта праблемных заданняў і творчых работ пры знаёмстве з тапанімікай Беларусі;

-- прынцып актуалізацыі апоры на міжпрадметныя веды і ўменні школьнікаў [Сафонова с.20]

Пры выкладанні курса на выбар настаўнік можа рэалізаваць свае творчыя памкненні, забяспечыць прафесійны рост з улікам уласных здольнасцей і магчымасцей, даказаць эфектыўнасць выкарыстання разнастайных метадаў і прыёмаў навучання, прадэманстраваць выніковасць розных відаў класнай і пазакласнай работы і інш.

Свядомы выбар курса (з улікам рэальных інтарэсаў, асабістых здольнасцей, патрэб сённяшняга і заўтрашняга дня) і магчымасць вучняў планаваць сваю адукацыйную траекторыю ў пазаўрочны час дазваляе настаўніку разлічваць на павышаную матывацыю навучання, зацікаўленасць акрэсленай праблемай і вынікамі яе вырашэння, творчае стаўленне да працы.

Зразумела, што знаёмства з антрапонімамі і тапонімамі адбываецца на працягу ўсяго навучання ў школе, але інфармацыя падаецца не цэласна, а ў выглядзе каментарыяў пры вывучэнні той ці іншай тэмы на ўроках мовы, літаратуры, гісторыі, геаграфіі і іншых прадметаў.

Нягледзячы на тое, што вышэйпамянёныя курсы на выбар маюць свае прыватныя мэты і задачы, яны накіраваны на

-- задавальненне пазнавальных інтарэсаў у засваенні антрапаніміі і тапаніміі Беларусі ў кантэксце беларускай і сусветнай культуры, пашырэнне кругагляду школьнікаў;

-- паглыбленне ведаў пра лексічнае багацце беларускай мовы, папаўненне слоўнікавага складу нацыянальна-маркіраванымі лексічнымі адзінкамі, удасканаленне ўменняў праводзіць аналіз тапонімаў і антрапонімаў паводле структуры, утварэння, паходжання, карыстацца імі ў маўленні ў адпаведнасці з камунікатыўнай культурай;

-- фарміраванне ўменняў рыхтаваць паведамленні пра беларускія антрапонімы і тапанімічныя назвы на аснове навуковых крыніц, уласных назіранняў і даследаванняў;

-- развіццё здольнасцей выкарыстоўваць беларускую мову як сродак адукацыі і самаадукацыі ў галіне культуразнаўства і лінгвакультуразнаўства;

-- развіццё творчага патэнцыялу, інтэлекту, пазнавальнай актыўнасці, культуразнаўчай і маўленчай назіральнасці, даследчыцкіх навыкаў, творчых здольнасцей;

-- фарміраванне духоўна-арыентаванага мыслення, маральных якасцей, нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў

Праграма “Беларуская антрапаніміка” прадугледжвае азнаямленне з уласнымі імёнамі, мянушкамі, імёнамі па-бацьку, прозвішчамі, псеўданімамі, іх гісторыяй, семантыкай, структурай, этымалогіяй. Пры знаёмстве з імёнамі ўвага звяртаецца на язычніцкія і хрысціянскія імёны (каталіцкія і праваслаўныя), новыя імёны савецкага часу, сацыяльна-палітычныя ўмовы функцыянавання антрапонімаў, адметнасць ужывання імёнаў у творах вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры. Асаблівая ўвага звяртаецца на прычыны ўзнікнення прозвішчаў і мянушак, спецыфічныя беларускія і запазычаныя прозвішчы, адметнасць іх семантыкі, утварэння і функцыянавання ў розныя перыяды развіцця грамадства і ў розных сацыяльных сферах, асаблівасць функцыянавання ў творах мастацкай літаратуры. Вучням прапануецца авалодаць ведамі пра спецыфіку псеўданімаў беларускіх пісьменнікаў, антрапанімічных назваў у параўнанні з антрапанімічнымі назвамі іншых славянскіх і неславянскіх моў.

Пры вывучэнні прозвішчаў вучням мэтазгодна на прыкладах прадэманстраваць лекіска-семантычны аналіз прозвішчаў адапелятыўнага паходжання, якія адлюстроўваюць самыя разнастайныя галіны жыццядзейнасці народа. Так, адапелятыўныя прозвішчы могуць суадносіцца з назвамі а) знешняга выгляду чалавека (*Бяляўскі, Гладкі*), б) разумовымі здольнасцямі, характарам (*Шчасны – шчаслівы, Шаблоўскі – паўдн. “балбатун, ілгун, бадзяга”*); в) хвароб і фізічных недахопаў людзей (*Варапай – абл. “сляпы чалавек*”, *Курловіч – літ. kurlas “глухі”*); г) прафесій: каваль (*Кавалеўскі, Кавалёў, Кавальчук*), святар (*Папок,*

*Папковіч*), д) роднасці, сваяцтва (*Дзядзюля – пам. Дзядзя, Пазняк – позняе дзіця*), е) жывёл і раслін (Казлоўскі, Мурашка, Будай – кірг. пшаніца, веташ), ж) з'яў прыроды (Шарэйка – рус. арх. шарэй "туман", Мільгуй – магчыма з літ. Migla "туман") і інш. [1, с.293-295]

Матэрыял, пададзены ў праграме "Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка", акрэслены наступнымі раздзеламі: "Паняцце тапаніміі", "Вытокі геаграфічных назваў Беларусі", "Асаблівасці ўтварэння тапонімаў", "Тапанімічныя назвы як адлюстраванне жыцця і побыту народа", "Этнатапанімія Беларусі", "Шляхі адраджэння беларускай тапаніміі". Колькасць тэм пры вывучэнні кожнага раздзела залежыць ад аб'ему вучэбнага матэрыялу, спосабу арганізацыі вучэбнага працэсу, колькасці творчых праектаў і г.д. Так, падаецца абавязковым у раздзеле "Паняцце тапанімікі" не толькі пазнаёміць школьнікаў з асноўнымі анамастычнымі паняццямі, такімі як тапонім, мікратапонім, айконім, гідронім, этнонім і інш.), але і засяродзіцца на заканамернасцях, якія характэрны як для беларускай тапаніміі, так і для тапаніміі розных народаў свету. Так, адной з заканамернасцей тапанімікі з'яўляецца меркаванне, што адна і тая прымета можа быць пакладзена ў аснову розных тапонімаў: *Навагрудак (бел.), Новгород (рус.), Навабад (тадж.), Ньюсіты ці Ньюкасл (англ.), Неапаль (італ.), Нойштад (ням.), Шахрэ-Ноу (перс.).*

Пры знаёмстве з тапанімічнымі назвамі як адлюстраваннем жыцця і побыту народа варта засяродзіцца на паняццях "*народная і навуковая тэрміналогія*", таму што пры выкананні творчых работ па выяўленні этымалогіі геаграфічных назваў вучні схільныя больш увагі звяртаць на народныя паданні і легенды, а не на навуковае тлумачэнне тапоніма ці мікратапоніма. У якасці прыклада можна прывесці народнае тлумачэнне назваў гарадоў Мінск, Магілёў, Гомель, Мазыр і параўнаць яго з меркаваннямі навукоўцаў адносна гэтых найменняў. Так, паводле народнай этымалогіі, у аснове назвы горада Мазыра ляжыць спалучэнне слоў "мой жыр", якія крычаў пры пераправе праз Прыпяць скваўпны яўрэй, убачыўшы, што перакулілася ў ваду яго бочка з тлушчам. Падводзячы пад тлумачэнне гэтай назвы навуковую аснову, вучоныя сцвярджаюць, што першае ўпамінанне пра Мазыр было ў 1155 годзе, а яўрэі на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'явіліся ў канцы XVI стагоддзя, ды і то ў Брэсце і Гродне. На думку вучоных, доўгатэрміновыя кантакты мясцовага насельніцтва з обрамі далі магчымасць замацавацца ў мове вялікай колькасці іранскіх і цюркскіх слоў, сярод якіх і слова *мажора* ў значэнні "пасяленне на ўзгорках", што адпавядае ландшафту Мазыра, і можа выступаць утваральнай асновай назвы. Яшчэ адна з навуковых версій – сувязь назвы з імем этнічнай польскай групы *мазуры* [4].

Пры рабоце над кожнай тэмай вучні

-- слухаюць лекцыі настаўніка па тэматычных падраздзелах, матэрыял да якіх складана знайсці або выклікае цяжкасці ў засваенні;

-- прымаюць актыўны ўдзел у семінарскіх і практычных занятках;

-- выконваюць групавыя і індывідуальныя праекты і выступаюць са справаздачамі па іх,

-- ацэньваюць разам з настаўнікам якасць сваёй работы.

Падчас засваення курсаў “Беларуская антрапаніміка” і “Беларуская тапаніміка” інтэгруюцца і шырока выкарыстоўваюцца веды вучняў, атрыманыя пры вывучэнні такіх дысцыплін, як гісторыя, геаграфія, літаратура і інш. На занятках мэтазгодна спалучаць калектыўныя і індывідуальныя формы работы, ствараць атмасферу супрацоўніцтва. Вучні аб’яднаны адзінай мэтай, але кожны з іх мае права на выражэнне ўласнай думкі адносна той ці іншай лінгвістычнай праблемы. Роля настаўніка заключаецца ў стварэнні праблемнай сітуацыі і арганізацыі пошуку ісціны.

Нягледзячы на тое, што дамінуючай формай работы на занятках з’яўляецца франтальнае апытанне, настаўніку больш увагі варта надаваць індывідуальнай і групавой рабоце, у ходзе якой адбываецца самарэалізацыя вучня, павышаецца яго творчая актыўнасць, пазнавальныя здольнасці. Зразумела, што рэалізаваць пастаўленыя мэты магчыма толькі ў тым выпадку, калі засваенне матэрыялу будзе ажыццяўляцца на аснове праблемных пытанняў і заданняў: пазнавальна-пошукавых, пошукава-даследчых. Прычым гэта могуць быць групавыя і індывідуальныя праекты, якія дазваляюць выпрацаваць уменні і навыкі ў лінгвакультурнай адукацыі і самаадукацыі. Побач з традыцыйнымі творчымі праектамі (дакладамі, рэфератамі, газетамі і інш.) мэтазгодна выкарыстоўвацьтакія, як

-- вочныя і завочныя экскурсіі (афармленне буклетаў да іх);

-- камп’ютэрныя часопісы,

-- дыстанцыйны абмен інфармацыяй з вучнямі іншых школ, якія займаюцца праблемамі тапанімікі і антрапанімікі;

-- даследаванні, заснаваныя на правядзенні параўнальнага аналізу тапонімаў розных рэгіёнаў Беларусі, беларускай і рускай анамастычнай лексікі і інш.

Прычым для ідывідуальнай работы можна прапанаваць напісанне даклада (рэферата), невялікае даследаванне і яго прэзентацыю; складанне тэстаў, заданняў, крыжаванак, віктарын і інш. Увага настаўніка павінна быць звернута на ўменні вучняў абагульняць, параўноўваць, сістэматызаваць, якія шырока выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы выступленняў, рэалізацыі творчых заданняў і г.д. Для ажыццяўлення групавога праекта прапануюцца камп’ютэрныя праграмы, сценгазеты, фотастэнды, інтэрв’ю, апытанне, экскурсіі, сустрэчы з даследчыкамі анамастычнай лексікі, краязнаўцамі, складанне антрапанімічных і тапанімічных слоўнікаў і інш. Калектыўна ажыццяўляюцца такія праекты, як круглы стол, тэматычныя вечары, лінгвакультуралагічны марафон і інш.

Так, цікавым для вучняў будзе вусны лінгвістычны часопіс “Что в імені тебе моём”, у якім пададзены рубрыкі “Беларускія замежнікі”, “Імёны 20 --30-ых гадоў”, “Сучасныя прозвішчы праз прызму часу”. З цікавасцю дзевяцікласнікі даведаюцца, што іх імёны (*Даніла, Марыя, Іван, Арцём, Галіна* і інш.) на самай справе адносяцца да лацінскіх,

старажытнагрэчаскіх, старажытнаяўрэйскіх, рымскіх, якія пасля прыняцця хрысціянства ў канцы дзесятага стагоддзя паступова выцеснілі беларускія імёны. Старажытныя беларускія імёны значна адрозніваліся ад сучасных. Яны адлюстроўвалі ўласцівасці і якасці людзей, асаблівасці характару чалавека, дзень нараджэння, месца нараджэння, парадак нараджэння ў сям'і і інш. Таму для нас зараз успрымаюцца, як мянушкі, імёны *Найдзёна, Дарога, Трацяк, Ждан* і інш. Абразлівыя імёны *Паганка, Павук, Блыха*, якія давалі бацькі сваім дзецям, служылі для малых дзяцей своеасаблівым абярэгам ад нядобрых вачэй. Праца са слоўнікамі і даведачнымі матэрыяламі дазволіць высветліць, з якой мовы паходзяць і што абазначаюць імёны вучняў класа (*Алена – зяючая, сонечная, Даніла – суд божы, Кацярына – чыстая, непарочная*). Гаворачы пра імёны 20-х – 30-х гадоў мінулага стагоддзя, школьнікі адзначаюць, што пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі людзі атрымалі свабоду ў выбары імя (да гэтага яны даваліся ў адпаведнасці са спецыяльнымі кнігамі -- "Месяцасловамі" ці "Святцамі"), у выніку чаго ўзніклі такія імёны, як *Акцябрына, Іскра, Трактар, Марлен (Маркс і Ленін), Кім (Камуністычны інтэрнацыянал моладзі), Нэра (новая эра)* і інш. Зварот да гісторыі станаўлення сучаснага іменніка беларусаў прыводзіць да высновы, што беларускія імёны (афіцыйныя, размоўна-бытавыя, эмацыянальна-ацэначныя) вызначаюцца сваёй спецыфікай, адлюстроўваюць нацыянальны каларыт: *Анатоль, Кірыла, Настасся; Пётра, Янка, Зося; Юзік, Яначка, Янусь* і інш.). Спасылаючыся на даследаванні вучоных, можна прывесці шляхі адаптацыі запазычаных імён. Напрыклад, адбывалася спрашчэнне груп зычных на канцы імён *Бернард – Бернат, Лаврентий – Лаврент – Лаврен – Лаўрэн*; замена гука [ф] на [п], [х], спалучэнне гукаў хв *Афанасій –Апанас, Опанас, Панас* [5].

Нацыянальны каларыт дэманструюць антрапонімы, пададзеныя ў творах Янкі Купалы, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, таму мэтазгодна прапанаваць прааналізаваць стылістычную ролю антрапонімаў у творах класікаў мастацкай літаратуры.

Па-за ўвагай школьнікаў немэтазгодна пакідаць граматычны бок вывучэння антрапонімаў, у сувязі з чым прапануецца заданне праскланяць (калі магчыма) уласныя назвы, якія выклікаюць цяжкасці пры змяненні: прозвішчы на *–а, -ых (-іх), -о,* на зычны гук і інш.

У якасці міні-даследавання можна прапанаваць вывучэнне рэгіянальнай тапанімікі. Зразумела, што даследаванню мясцовых геаграфічных назваў павінна папярэднічаць спецыяльная падрыхтоўка. Так, вучню неабходна валодаць пэўнымі тэарэтычнымі ведамі па тапаніміцы, уменнем працаваць з навуковай літаратурай, збіраць фактычны матэрыял, ствараць картатэку тапонімаў і мікратапонімаў, класіфікаваць анамастычныя адзінкі паводле верагоднасці ўзнікнення, словаўтваральнай структуры, аналізаваць матэрыял у адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і задачамі даследавання, стылем і жанрам маўлення.

Так, выклікаюць цікавасць у вучняў даследаванні тыпу “Тапаніміка і мікратапаніміка Тураўскага рэгіёна”, “Назвы майго краю”, “Тапанімічная прастора прыказак і прымавак” і інш. Даследуючы тапаніміку Тураўшчыны, вучні адзначаць, што найбольш прадуктыўным сродкам утварэння з’яўляеца прыстаўка за- разам з іншымі словаўтваральнымі сродкамі (*Зацэрква, Залажэнь, Закоўпін, Заброддзе*), а ў мікратапаніміі шырока пададзены складаныя назвы (*Малыя гумна, Красны бераг, Ладычае поле*) і пашырана выкарыстанне прыналежных прыметнікаў (*Берыкава, Давудавае, Храпкоў*), што сведчыць пра прыватна-ўласніцкую сістэму землекарыстання. Асабліва адзначаецца, што крыніцай тапаніміі Тураўшчыны з’яўляюцца і самі тапонімы і мікратапонімы (*Брадок – Заброддзе, Груд – Загруддзе, В’юнішча – Подв’юнішча, Лешча – Залешча, Рэвут – Зарэвут* і інш.), прычым звяртаецца ўвага на ўплыў мясцовых гаворак на вымаўленне і напісанне назваў.

У выніку вывучэння курсаў на выбар вучні павінны

**ведаць**

--асноўныя антрапанімічныя і тапанімічныя паняцці;

-- культурна-гістарычныя карані беларускіх імён, прозвішчаў, геаграфічных назваў;

**-- умець**

--выяўляць антрапонімы і тапонімы ў тэкстах, характарызаваць іх паводле прапанаваных прымет, тлумачыць утварэнне назвы, адметнасць яе выкарыстання ў маўленні;

-- працаваць з навуковай і даведачнай літаратурай,

-- збіраць, сістэматызаваць і прэзентаваць антрапанімічны і тапанімічны матэрыял, выкарыстоўваючы вучэбную і навукова-папулярную літаратуру, матэрыялы сродкаў масавай інфармацыі, а таксама рэсурсы Інтэрнэта;

-- праводзіць аналогіі пры параўнанні і супрацьпастаўленні, абагульненні фактаў беларускай тапанімікі, рэферыраваць сабраны матэрыял;

-- рабіць паведамленні па пытаннях сучаснага і мінулага беларускай антрапанімікі і тапанімікі з выкарыстаннем ілюстрацый, цытат, літаратурных крыніц, фота і відэаматэрыялаў;

-- рыхтаваць матэрыялы пра беларускія тапонімы на аснове звестак па рэгіянальнай анамастыцы;

-- складаць вершы, рэбусы, крыжаванкі, віктарыны на аснове беларускай тапанімікі і мясцовых тапонімаў;

-- выконваць тапанімічныя праекты (у тым ліку з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій) і прэзентаваць іх.

Такім чынам, курсы на выбар “Беларуская антрапаніміка” і “Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка”, знаёмячы з культурнымі і гістарычнымі здабыткамі Беларусі, далучаючы да сусветнай культуры, дапамогуць рэалізаваць пазнавальныя інтарэсы школьнікаў, сфарміраваць лінгвакультуралагічную кампетэнцыю сродкамі беларускай мовы.

Літаратура:


1. Лаўрэнаў А., Міхайлаў П. Лексіка-семантычныя групы антрапонімаў адапелятыўнага паходжання (на матэрыяле прозвішчаў жыхароў Ждановіцкага с/с Мінскага раёна // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства. Ч.2. Віцебск, 1997.
2. Пальчик Г.В. Организационно-теоретические основания разработки вариативного компонента содержания общего среднего образования // Кіраванне ў адукацыі. – 2006. -- №8. – С. 3-10
3. Протчанка В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. - Мн.: НІА,2001.
4. Рылюк И.Я. Истоки географических названий Беларуси с основами общей топонимии. Мн., 1999.
5. Сафонова В.В. Культуроведение в системе современного языкового образования // Иностранные языки в школе. – 2001. -- №3.— С.
6. Усціновіч А.К. Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны IV – XVIII стст. – Мн, 1975.